**Справаздача**
**IX з’езду ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»**
**пра дзейнасць арганізацыі ў 2012–2015 г.г.**

ПЛАН:

I. Агульныя звесткі пра арганізацыю
II. Фактары, якія ўплывалі на дзейнасць арганізацыі ў справаздачны перыяд, і агульная ацэнка сітуацыі
III. Дзейнасць арганізацыі
1. Юрыдычная падтрымка
2. Адукацыя
3. Арганізацыйная праца: рэгіёны, конкурсы, кампаніі
4. Сайт ГА «БАЖ»
5. Часопіс «Абажур»
6. Маніторынг сітуацыі ў галіне СМІ
7. Міжнароднае супрацоўніцтва

## I. АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (далей па тэксце — БАЖ) — добраахвотнае недзяржаўнае, непартыйнае аб’яднанне грамадзян, якія займаюцца прафесійнай журналісцкай дзейнасцю альбо садзейнічаюць яе развіццю.

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» дзейнічае з 1995 г.

БАЖ садзейнічае рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных, культурных і прафесійных правоў і законных інтарэсаў сяброў арганізацыі, іх творчаму самавыяўленню і росту прафесійнага майстэрства; стварэнню ўмоваў для забеспячэння свабоды слова і друку, права на бесперашкоднае атрыманне, захоўванне і распаўсюд інфармацыі; абароне правоў журналістаў і прынцыпаў свабоднай і прафесійнай журналістыкі.

Зараз на ўліку ў арганізацыі 1150 чалавек. Грамадскае аб’яднанне мае 5 арганізацыйных структур (рэгіянальных філій): Брэсцкую, Гомельскую, Лунінецкую, Маладзечанскую і Наваполацкую, — якія пастаўлены на ўлік мясцовымі органамі ўлады.

З 1997 г. БАЖ — асацыяваны сябра Міжнароднай Федэрацыі Журналістаў (IFJ), З 2013 г. БАЖ — поўны сябра Еўрапейскай Федэрацыі Журналістаў (EFJ). У 2014 г. ГА “БАЖ” стала часовым сябрам Міжнароднай асацыяцыі па абароне свабоды слова (IFEX).

У 2003 г. Сусветная асацыяцыя газет (WAN) узнагародзіла БАЖ Залатым пяром Свабоды (Golden Pen of Freedom prize). У снежні 2004 г. Еўрапейскі парламент уганараваў БАЖ прэміяй імя А. Сахарава «За свабоду думкі». У 2011 г. арганізацыя атрымала ўзнагароду Свабоды Атлантычнай Рады.

## II. ФАКТАРЫ, ЯКІЯ ЎПЛЫВАЛІ НА ДЗЕЙНАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫІ Ў СПРАВАЗДАЧНЫ ПЕРЫЯД

У перыяд з 2012 па 2015 г.г. арганізацыя сутыкнулася з шэрагам выклікаў. Узнікла неабходнасць рэагавання на:

- змены ў закон “Аб СМІ”, якія пагоршылі ўмовы дзейнасці СМІ і журналістаў,
- крымінальны пераслед журналістаў,
- практыку прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ без акрэдытацыі,
- выкарыстанне закона “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму” для абмежавання свабоды выказвання і абарачэння інфармацыі,
- эканамічныя праблемы, якія вызначалі стан беларускай медыясферы,
- абмежаванні доступу да інфармацыі,
- узмацненне прапаганды ў сувязі з падзеямі ва Украіне.

### Змены ў закон “Аб СМІ”, якія пагоршылі ўмовы дзейнасці СМІ і журналістаў

З 1 студзеня 2015 г. уступілі ў сілу папраўкі ў закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, прынятыя ў снежні мінулага года. Гэтыя папраўкі, у прыватнасці, распаўсюдзілі прадугледжаную законам адказнасць на інтэрнэт-СМІ і абавязалі іх адсочваць каментары наведнікаў сайтаў. Міністэрства інфармацыі атрымала права блакаваць доступ да анлайн-рэсурсаў (у тым ліку замежных) у пазасудовым парадку.

З пачатку года ўступіў у сілу і прэзідэнцкі дэкрэт №6 “Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў”, падпісаны 28 снежня 2014 г. Ён закранае і дзейнасць «інфармацыйных рэсурсаў, размешчаных у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт». Дэкрэт утрымлівае нормы, якія нясуць пагрозы як свабоднаму распаўсюду інфармацыі, так і свабоднаму доступу да яе.

19 лютага 2015 г. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь зацвердзілі Палажэнне аб парадку абмежавання доступу да інфармацыйных рэсурсаў (іх састаўных частак), размешчаных у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт. Сярод

новаўвядзенняў – магчымасць блакавання інтэрнэт-рэсурсаў, сродкаў забеспячэння ананімнасці (проксі-серверы, ананімныя сеткі тыпу Tor і г.д.), якія дазваляюць карыстальнікам інтэрнэт-паслуг атрымліваць доступ да інтэрнэт-рэсурсаў, доступ да якіх абмяжоўваецца. Судовае абскарджанне рашэння Мініфарма аб блакаванні сайта Палажэннем не прадугледжана.

## Крымінальны пераслед журналістаў

Улетку 2012 года ў розных рэгіёнах Беларусі былі распачатыя тры крымінальныя справы супраць журналістаў, звязаныя з іх прафесійнай дзейнасцю. Андрэй Пачобут (Гродна) быў абвінавачаны ў паклёпе ў дачыненні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Мікалай Петрушэнка (Віцебск) – у абразе прадстаўніка ўлады, Антон Сурапін (Слуцк) – у спрыянні парушэнню мяжы групай асобаў.

У кастрычніку 2012 г. справу Мікалая Петрушэнкі спынілі, бо лінгвістычная экспертыза не знайшла ў яго артыкуле нічога крымінальнага.

У сакавіку 2013 г. спынілі справу Андрэя Пачобута – з-за адсутнасці ў яго дзеяннях складу злачынства. Пра спыненне крымінальнага пераследу Антона Сурапіна КДБ афіцыйна аб’явіў у чэрвені 2014 г. Арышт Сурапіна ўзначаліў дзясятку самых абсурдных арыштаў 2012 г. у рэйтынгу Amnesty International.

Пад пагрозай крымінальнага пераследу ў канцы 2012 года быў вымушаны на пэўны час пакінуць Беларусь галоўны рэдактар “Arche. Пачатак” Валерый Булгакаў, абвінавачаны ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Фінансавыя органы правялі маштабную праверку дзейнасці рэдакцыі часопіса, заблакавалі рахунак рэдакцыі. В. Булгакаў вярнуўся ў Беларусь толькі пасля таго, як кантралюючыя органы абвясцілі, што крымінальныя справы ў дачыненні да супрацоўнікаў часопіса ўзбуджацца не будуць.

Аднак гэтыя пазітыўныя крокі не суправаджаліся сістэмнымі зменамі ў сферы СМІ. Наадварот, рабіліся захады рэпрэсіўнага характару ў дачыненні да СМІ і журналістаў.

Найбольшы грамадскі розгалас напрыканцы 2014 г. выклікала ўзбуджэнне ў лістападзе крымінальнай справы ў дачыненні да ваеннага аглядальніка газеты “Белорусы и рынок” Аляксандра Алесіна. Журналіст быў арыштаваны 25 лістапада і абвінавачаны ў здрадзе дзяржаве (арт. 356 КК РБ) і ўсталяванні супрацоўніцтва са спецыяльнай службай органаў бяспекі або разведвальным органам замежнай дзяржавы (арт. 356-1). 10 снежня адно з абвінавачанняў (у здрадзе дзяржаве) было скасаванае, і А. Алесін быў вызвалены з-пад варты пад падпіску аб нявыездзе.

## Практыка прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ без акрэдытацыі

У 2014 годзе ўлады сталі актыўна выкарыстоўваць інстытут акрэдытацыі для абмежавання дзейнасці журналістаў, што было нехарактэрна для папярэдніх гадоў. Падставай для прымянення да журналістаў ч. 2 арт. 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях стаў не змест іх матэрыялаў, а сам факт іх з'яўлення ў замежных СМІ.

Цягам 2014 г. па абвінавачванні ў працы без акрэдытацыі ў Беларусі было распачата 14 адміністрацыйных спраў. Сума штрафаў, спагнаных з журналістаў і распаўсюднікаў друкаванай прадукцыі на працягу 2014 года, дасягнула 105 мільёнаў рублёў (каля $ 10 000). У тым ліку з журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, спагналі 52 млн 050 тыс.

У першым квартале 2015-га пераслед журналістаў за супрацоўніцтва з замежнымі СМІ працягваўся. Да пачатку красавіка 2015 г. сума штрафаў за гэта склала ўжо больш за 40 млн рублёў. Сумы штрафаў звычайна вагаюцца ад 20 да 40 базавых велічынь (на момант падрыхтоўкі справаздачы адна базавая велічыня складала 180 тысяч рублёў).

Найбольш неабароненымі застаюцца журналісты, якія супрацоўнічаюць з тэлеканалам "Белсат" і "Беларускім Радыё Рацыя". Яны рэгулярна атрымліваюць адмовы ў акрэдытацыі. У 2014 тэлеканалу "Белсат" забаранілі адкрыццё прадстаўніцтва ў Беларусі, а Вярхоўны Суд увёў забарону на выкарыстанне гандлёвага знаку «Белсат» у Беларусі.

## Практыка прымянення закона "Аб супрацьдзеянні экстрэмізму" для абмежавання свабоды выказвання і абарачэння інфармацыі

Узмацнілася выкарыстанне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для падаўлення свабоды выказвання меркаванняў. Так, у красавіку 2013 г. па заяве ўпраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці суд Ашмянскага раёна прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі фотаальбом "Прэс-фота Беларусі 2011".

Фотаальбом быў выдадзены па выніках конкурсу прэс-фатаграфіі Беларусі, які праводзіцца з 2010 г., а ў журы конкурсу ўваходзяць вядомыя фатографы з розных краін. Альбом быў надрукаваны ў 2012 г. і свабодна прадаваўся ў краіне, а фотаздымкі з альбома без наступстваў публікаваліся ў беларускіх перыядычных выданнях і размяшчаліся ў стужках інфармацыйных агенцтваў.

Спасылаючыся на гэтае судовае рашэнне, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у верасні пазбавіла ліцэнзіі выдавецтва "Логвінаў", якое з'яўляецца адным з флагманаў беларускага незалежнага кнігавыдання. Выдавецтва было вымушана перанесці выпуск кніг у суседнюю Літву. У студзені 2015 г. Эканамічны суд г. Мінска пастанавіў канфіскаваць у прыватнага прадпрыемства "Логвінаў" прыбытак амаль у мільярд рублёў за тое, што яно гандлявала ў Беларусі кнігамі без рэгістрацыі ў Дзяржаўным рээстры выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюднікаў друкаваных выданняў пры

Мінінфармацыі. (У сакавіку 2015 г. Міністэрства ўсё ж зарэгістравала прадпрыемства ў згаданым рэестры.)

У жніўні 2014 г. пастановай Савета Міністраў №810 былі створаныя Рэспубліканская і абласныя экспертныя камісіі па ацэнцы інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці (адсутнасці) ў ёй прыкмет экстрэмізму. Па стане на пачатак 2015 года ўжо больш за 100 матэрыялаў было разгледжана не прадмет наяўнасці ў іх прыкмет экстрэмізму. Такія лічбы былі агучаныя 5 лютага на калегіі Міністэрства інфармацыі. У 25 з іх экспертныя камісіі знайшлі “прыкметы экстрэмізму”.

## Эканамічныя праблемы, якія вызначалі стан беларускай медыясферы

Беларускія незалежныя СМІ працуюць ва ўмовах эканамічнай дыскрымінацыі. На працягу амаль дзесяці гадоў больш за 10 недзяржаўных друкаваных выданняў маюць праблемы з распаўсюдам праз дзяржаўныя прадпрыемствы-манапалісты «Белпошта» і «Белсаюздрук». За доступ да сістэмы распаўсюду незалежныя СМІ павінныя плаціць значна больш, чым дзяржаўныя выданні.

У краіне ўведзеныя розныя кошты на паслугі друкарань для дзяржаўных і недзяржаўных выданняў. Пры гэтым недзяржаўныя выданні сутыкаюцца з нематываванымі адмовамі друкарань. Напрыклад, у снежні 2014-га штотыднёвік «Свободные новости плюс» атрымаў нечаканую адмову ад друкарні «Плутас-маркет».

У 2014 годзе ўлады працягнулі практыку абмежаванняў на размяшчэнне рэкламы ў недзяржаўных СМІ. Рэкламадаўцам не рэкамендуецца рабіць заказы ў недзяржаўных СМІ.

Эканамічныя цяжкасці сталі прычынай змянення складу акцыянераў і кіраўніка рэдакцыі газеты «Белорусы и рынок». Гэта стала пачаткам канфлікту, напрыканцы сакавіка 2015 г. працоўны калектыў рэдакцыі выказаў недавер новаму кіраўніку, а праз некалькі дзён калегі пачалі пісаць заявы на звальненне. ГА “БАЖ” прыклаў намаганні, каб выступіць у ролі медыятара і прапанаваў сваю экспертную дапамогу па ўрэгуляванні працоўных стасункаў, распрацоўцы рэдакцыйнай палітыкі. Аднак сітуацыя і па сёння застаецца складанай.

## Абмежаванні доступу да інфармацыі

Традыцыйнай праблемай застаецца доступ да інфармацыі, што абмяжоўвае дзейнасць журналістаў. У апошнія тры гады захаваліся значныя абмежаванні на доступ да інфармацыі пра дзейнасць дзяржструктур, што абумоўлена цэлым шэрагам законаў – «Аб дзяржаўных сакрэтах», «Аб дзяржаўнай службе» і інш. Спіс дзяржорганаў, якія маюць права засакрэчваць

інфармацыю, дасягнуў 60-і дзяржаўных устаноў і цяпер ўключае Міністэрства інфармацыі, Белтэрадыёкампанію і іншыя структуры.

**Узмацненне прапаганды ў сувязі з падзеямі ва Украіне**

У сувязі з канфліктам ва Украіне інфармацыйнае поле Беларусі апынулася ў 2014 годзе пад уздзеяннем агрэсіўнай прапагандысцкай машыны. Расійская прапаганда трапіла на ўрадлівую беларускую глебу, і беларускаму грамадству не хапіла крытычнага стаўлення да прапаганды. Акрамя таго, адзначаецца істотнае дэвальваванне прафесійных стандартаў. Маніпуляванне інфармацыяй набыло пагрозлівы характар для журналістыкі як прафесіі. Уплыў прапаганды на грамадскую свядомасць стаў глабальнай праблемай, якая выйшла за межы асобна ўзятых краін.

## III. ДЗЕЙНАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫІ

Нягледзячы на згаданыя цяжкасці, у справаздачны перыяд арганізацыя захавала ўстойлівасць і свае прынцыпы, скіравала дзейнасць на выкананне статутных мэтаў і рашэнняў папярэдняга з’езду:
- абарону правоў журналістаў;
- папулярызацыю высокіх стандартаў і прынцыпаў журналісцкай дзейнасці (якасная журналісцкая аналітыка, медыякрытыка);
- садзейнічанне творчаму самавыяўленню, прававой адукацыі і росту прафесійнага майстэрства журналістаў;
- падтрымку маладых лідараў БАЖ;
- пашырэнне і ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва;
- паляпшэнне камунікацыі і наладжванне зваротнай сувязі з сябрамі арганізацыі;
- узмацненне арганізацыйнай структуры БАЖ.

### 1. Юрыдычная падтрымка

Юрыдычная падтрымка сябраў арганізацыі застаецца прыярытэтам дзейнасці БАЖ.

Гэтая праца ажыццяўляецца ў чатырох асноўных накірунках:
- непасрэдная абарона правоў сябраў БАЖ у судах і іншых дзяржаўных органах, пры затрыманнях і г. д.; абскарджанне рашэнняў дзяржаўных органаў;
- звароты ў дзяржаўныя органы і ўстановы дзеля прадухілення парушэння правоў СМІ і журналістаў і з мэтай пакарання вінаватых;

- папярэдняя праца з журналістамі з мэтай пазбегнуць магчымых прэтэнзій:
  – інфармаванне пра змены заканадаўства і практыкі яго рэалізацыі;
  – правядзенне семінараў, трэнінгаў, іншых форм калектыўнай працы з журналістамі;
  – індывідуальнае кансультаванне журналістаў па ўсіх пытаннях, звязаных з іх прафесійнай дзейнасцю ці прафесійным статусам;
  – папярэдняя прававая экспертыза артыкулаў ці іншых матэрыялаў у СМІ з мэтай пазбягання прэтэнзій да рэдакцый і журналістаў.
- праца над удасканаленнем дзейнага заканадаўства аб СМІ шляхам яго аналізу, выпрацоўкі і лабіявання прапаноў па яго паляпшэнні.

Юрыдычную дапамогу аказваюць юрысты і праваабаронцы БАЖ, якія працуюць не толькі ў Мінску, але і ў буйных рэгіянальных гарадах краіны. У тых выпадках, калі юрыстаў БАЖ не дапускаюць прадстаўляць інтарэсы сяброў арганізацыі (у прыватнасці, падчас адміністрацыйных працэсаў), БАЖ дапамагае журналістам знайсці кваліфікаваных адвакатаў.

У структуры непасрэднай прававой дапамогі (першы накірунак юрыдычнай падтрымкі сяброў арганізацыі) ізноў, як і перад мінулым з’ездам, адбыліся пэўныя змены.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. у цэнтры ўвагі юрыстаў былі затрыманні журналістаў і беспадстаўнае прыцягненне іх да адказнасці (не толькі адміністрацыйнай, але і крымінальнай). З сярэдзіны 2012 г. колькасць затрыманняў журналістаў пачала змяншацца. Гэта не толькі звязана з памяншэннем колькасці і напружанасці пратэстных акцый у краіне, падчас якіх цярпелі і журналісты, але і з’яўляецца вынікам мэтанакіраванай працы, якую прадстаўнікі БАЖ вялі і працягваюць весці з кіраўніцтвам МУС (можна казаць пра пэўнае ўзаемаразуменне, якое дасягнута з ГУУС Мінгарвыканкама). Калі ў “крызісны” паслявыбарчы 2011 г. БАЖ зафіксаваў больш за 160 затрыманняў журналістаў, то ў 2012-2013 г. іх колькасць вярнулася да “звычайнай” – 50-60 затрыманняў за год, а ў 2014 г. – зменшылася да 29. З пачатку 2015 г. БАЖ зафіксаваў 4 выпадкі затрыманняў.

З красавіка мінулага года павялічылася колькасць адміністрацыйных спраў супраць журналістаў, асабліва тых, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ без акрэдытацыі. Іх сталі абвінавачваць ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ і прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафа. Журналістам аказваецца ўся магчымая юрыдычная дапамога, у тым ліку пры абскарджанні судовых пастановаў, але, на жаль, вырашыць справы на карысць журналістаў прававымі сродкамі не атрымліваецца. Звароты ў дзяржаўныя органы з гэтай нагоды таксама засталіся безвыніковымі. БАЖ заклікае сваіх сяброў пасля вычарпання ўсіх нацыянальных прававых магчымасцяў абароны правоў звяртацца ў Камітэт ААН па правах чалавека і гатовы дапамагчы іх скласці.

Сярод адрасатаў зваротаў БАЖ у справаздачны перыяд – Камітэт дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэт дзяржкантролю, Следчы камітэт, Мытны камітэт, Палата прадстаўнікоў, Мінітэрства юстыцыі, Вярхоўны суд, Гродзенскі абласны суд, Генеральная праўратура, Міністэрства інфармацы і інш. Звароты тычыліся абароны асобных сябраў арганізацыі, прадухілення парушэння журналісцкіх правоў, зменаў у заканадаўстве.

Экспертыза законапраектаў і прынятых прававых актаў у галіне СМІ заставалася адным з галоўных накірункаў працы юрыстаў БАЖ, якія неаднаразова звярталася да дзяржаўных органаў і ўстановаў з заклікам абмеркаваць канкрэтныя прапановы па паляпшэнні заканадаўства аб СМІ. Аднак трэба канстатаваць, што экспертная дапамога БАЖ засталася незапатрабаванай дзяржаўнымі органамі, і, горш за тое, – заканадаўства змянілася ў бок узмацнення жорсткасці. У такіх абставінах у сябраў арганізацыі з’явіліся патрэбы ў ведах пра змены ў заканадаўстве і новыя ўмовы працы СМІ (у тым ліку інтэрнэт-рэсурсаў). Юрысты БАЖ аказваюць кансультацыі, праводзяць трэнінгі і семінары па гэтых пытаннях.

Гэтаксама застаюцца запатрабаванымі трэнінгі па бяспецы журналіцкай дзейнасці. За справаздачны перыяд юрысты БАЖ правялі для сябраў арганізацыі больш за 15 трэнінгаў і семінараў па гэтым пытанні.

Юрысты БАЖ рыхтуюць кансультацыйныя і аналітычныя матэрыялы па заканадаўстве ў галіне СМІ і практыцы яго прымянення, якія размяшчаюцца на сайце БАЖ у рубрыцы “Права і СМІ”.

## 2. Адукацыя

Адукацыйныя праграмы БАЖ ставяць за мэту падвышэнне прафесійнага ўзроўню практыкуючых журналістаў, што дазваляе сябрам арганізацыі прытрымлівацца высокіх стандартаў прафесіі.

За апошнія тры гады былі дыферэнцыяваныя накірункі адукацыйных праграм і вылучаныя асноўныя мэтавыя групы:

- практыкуючыя журналісты,
- школьнікі і студэнты,
- менеджары СМІ.

Для кожнай з пералічаных мэтавых груп быў праведзены шэраг трэнінгаў, семінараў і курсаў, якія дазволілі ім атрымаць веды ў профільнай галіне журналістыкі. Адукацыйныя праграмы насілі як доўгатэрміновы, так і кароткатэрміновы характар, што было абумоўлена патрабаваннямі кожнага канкрэтнага курса.

Штогод БАЖ праводзіць як мінімум 10 базавых курсаў, кожны з якіх разлічаны на 2-3 месяцы. Курсы праходзяць як у вочным, так і ў дыстанцыйным рэжыме. Мэта ўсіх адукацыйных праграм — падвышэнне кваліфікацыі журналістаў, што робіць сябраў БАЖ канкурэнтаздольнымі на медыйным рынку Беларусі. Праграмы курсаў складаюцца паводле самых

сучасных методык навучання прафесійных журналістаў у галіне як друкаванай, электроннай, так і анлайн-журналістыкі.

Пры дапамозе адукацыйных праграм БАЖ імкнецца стымуляваць сябраў арганізацыіі да імкнення быць «універсальнымі журналістамі», якія валодаюць усімі сучаснымі інструментамі прафесіі: web, фота, відэа, аўдыё. Адукацыйныя праграмы дазваляюць сябрам БАЖ арыентавацца ў тэндэнцыях развіцця новых тэхналогій, забяспечваюць прафесійны рост і дапамагаюць максімальна скарыстаць магчымасці медыйнага рынку Беларусі.

Цягам апошніх трох гадоў БАЖ зладзіў шэраг in-house трэнінгаў, якія праводзіліся выключна зыходзячы з пажаданняў кіраўніцтва газет:

- кантэнт-аналіз выданняў (выяўленне станоўчых і негатыўных асаблівасцей працы выданняў),
- журналісцкія жанры (інтэрв'ю, рэпартаж, нататкі, аналітычныя артыкулы і г. д.),
- распрацоўка асобных тэмаў (анлайн-журналістыка, загалоўкі, ліды і г. д.).

Выезды ў рэгіянальныя выданні сталі агульнай практыкай. Журналісты рэгіянальных СМІ на месцы атрымліваюць парады дзеля паляпшэння працы рэдакцыі.

Бяспека журналістаў і паводзіны ў экстрэмальных сітуацыях, камп'ютарная бяспека аналізуюцца на спецыялізаваных кароткатэрміновых семінарах.

Этычныя стандарты прафесіі абмяркоўваюцца на адмысловых сесіях, якія ладзяцца ў межах адукацыйна-асветніцкага праекту FOJO і БАЖ з удзелам прадстаўнікоў Беларускага Саюза Журналістаў.

Ад прафесійнай падрыхтоўкі менеджараў СМІ шмат у чым залежыць устойлівасць рэдакцый. Разуменне гэтага дазволіла вылучыць менеджараў у асобную мэтавую группу. Для менеджараў СМІ цягам апошніх трох гадоў ладзіліся асобныя доўгатэрміновыя курсы па стратэгічным планаванні, менеджменце СМІ, іншых накірунках.

Усяго за апошнія тры гады больш за 400 чалавек прайшлі навучанне ў межах адукацыйных праграм, што даваляе казаць пра сістэмную працу БАЖ у гэтым накірунку.

## 3. Арганізацыйная праца: рэгёны, конкурсы, кампаніі

### Рэгіёны

За апошнія 3 гады праца рэгіянальных філіяў актывізавалася, стала больш спланаванай і змястоўнай, скіраванай на патрэбы мясцовых сябраў арганізацыі. Кіраўнікі і актывісты філіяў бралі актыўны ўдзел у абмеркаванні дзейнасці, планаванні працы БАЖ, распрацоўцы новай стратэгіі арганізацыі, “мазгавых штурмах” і працоўных сустрэчах.

У рэгёнах усё больш адыходзяць ад практыкі правядзення мерапрыемстваў па ініцыятыве цэнтральнага офіса. Тым не менш,

рэгіянальныя журналісты актыўна далучаліся амаль да ўсіх акцый і кампаній, якія ладзіў цэнтральны офіс БАЖ.

Найбольшую зацікаўленасць выклікалі рэгіянальныя прэс-туры і акцыя “Станем за журналістыку!”.

Штогод ладзіцца па некалькі прэс-тураў у экалагічна небяспечныя зоны: Салігорск, Крычаў, Лунінец, Гомель і інш.

Мясцовыя філіі і суполкі сталі надаваць больш увагі планаванню асабістых ініцыятываў, рэалізацыі як мясцовых, так і міжрэгіянальных мерапрыемстваў. Добры прыклад – правядзенне гомельскай філіяй БАЖ спартова-культурніцкага фэста “БАЖынкі – 2014”.

Пачыналіся як мясцовыя ініцыятывы, але з цягам часу сталі міжрэгіянальнымі конкурсы «За адданасць прафесіі» (Гомель), для маладых журналістаў “Твой стыль” (Гродна) у рамках фестывалю моладзевай журналістыкі (ладзіць Цэнтр “Трэці сектар” пры падтрымцы БАЖ), “На лепшую рэгіянальную філію” (па выніках працы за год).

Рэгіянальныя журналісты актыўна сумяшчалі прафесійную і грамадскую працу: за 3 гады ў рэгіянальных філіях і суполках БАЖ праведзена больш за 170 мерапрыемстваў: 5 выставаў, 8 круглых сталоў, 17 прэс-клубаў, 14 прэзентацый, 12 творчых вечарын і сустрэч, 14 майстар-класаў, 42 семінары і трэнінгі (фотасправа – 4, бяспека – 17, жанры журналістыкі – 5, мультымедыя – 6 і інш.), 11 прэс-тураў, 14 акцый (у тым ліку дабрачынных, салідарнасці, памяці), 46 – сходаў і г.д.

З 18-і рэгіянальных суполак найбольш актыўнымі ў справаздачны перыяд былі Гомельская, Глыбоцкая, Лунінецкая, Крычаўская, Бабруйская, Брэсцкая, Віцебская. Менавіта яны атрымалі дыпломы БАЖ як найлепшыя філіі і суполкі па выніках працы за апошнія тры гады.

Акрамя ўдзелу ў агульнабажаўскіх адукацыйных праграмах, рэгіянальныя структуры актыўна выкарыстоўвалі магчымасць запрашаць да сябе ў рэдакцыі, філіі і суполкі спецыялістаў па жанрах журналістыкі і мультымедыя, юрыстаў і псіхолагаў, медыяэкспертаў і кансультантаў.

Запрошаныя спецыялісты аналізавалі сітуацыю і кантэнт выданняў, давалі экспертныя ацэнкі і дзяліліся асабістымі высновамі, кансультавалі журналістаў па прафесійных пытаннях, вучылі на практыцы скарыстоўваць веды і больш якасна выконваць сваю працу. Яны дапамагалі журналістам у рэгіёнах вырашаць пытанні прафесійнай дзейнасці, абаранялі інтарэсы сябраў і калектываў у судах, тлумачылі журналістам змены ў заканадаўстве, іх правы і абавязкі, пытанні этыкі і бяспекі.

Пры рэгіянальных рэдакцыях на працягу апошніх трох гадоў працавалі Школы маладога журналіста. Трэнерская каманда БАЖ (супольна з мясцовымі (рэдакцыйнымі) трэнерамі) навучала асновам журналістыкі больш за сотню маладых людзей. Дзякуючы супрацы БАЖ з рэдакцыйнымі калектывамі і Асацыяцыяй рэгіянальных выдаўцоў, новых штатных супрацоўнікаў набылі рэдакцыі газет: “Інфа-кур’ер”, “Рэгіянальная газета”, “Борисовские новости”, “Intex-press”, “Информ-прогулка”, “Ганцавіцкі час”, “Газета Слонімская”, сайты “Медыя-Палессе”, “Kraj.by” і інш.

З выпускнікамі ШМЖ адукацыйная праца працягваецца праз больш прасунутыя курсы і майстар-класы, семінары і трэнінгі, дыстанцыйнае навучанне.

Напрыканцы кожнага года ў філіях і суполках праходзілі працоўныя сустрэчы і сходы, на якіх сябры абмяркоўвалі вынікі зробленай працы, высвятлялі патрэбы шараговых сябраў, планавалі сваю дзейнасць на будучыню. У гэты працэс былі ўключаны кіраўнікі філіяў, актывісты, шараговыя сябры. Ён даваў магчымасць кіраўніцтву арганізацыі атрымаць інфармацыю для прыняцця далейшых рашэнняў, дазваляў філіям і суполкам больш арганізавана і рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы і магчымасці арганізацыі, забяспечваць сябрам роўны доступ да нашых сэрвісаў, аб’ядноўваў і згуртоўваў арганізацыю.

Па водгуках рэгіянальных сябраў, за апошнія гады філіі і суполкі сталі больш самастойнымі, арганізаванымі і згуртаванымі. У БАЖ значна ўзмацнілася салідарнасць і ўзаемадапамога. Кіраўніцтва арганізацыі стала надаваць больш увагі патрэбам мясцовых журналістаў, больш аператыўна рэагаваць на запыты і падтрымліваць мясцовыя ініцыятывы.

## Кампаніі, конкурсы

**Конкурс «Вольнае слова»** арганізаваны для падтрымання высокіх стандартаў прафесіі сярод сябраў БАЖ.

Пяць намінацый конкурсу дазваляюць журналістам прадставіць лепшыя тэксты ва ўсіх жанрах сучаснай журналістыкі. У кожнай намінацыі вызначаецца па тры пераможцы.

У конкурсе ўдзельнічаюць журналісты найбуйнейшых беларускіх друкаваных, электронных і анлайн-СМІ.

Пераможцамі конкурсу станавіліся прадстаўнікі не толькі незалежных, але і дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, што сведчыць пра імкненне БАЖ падтрымліваць стандарты прафесіі ва ўсёй журналісцкай супольнасці Беларусі.

У конкурсе бяруць актыўны ўдзел прадстаўнікі рэгіянальных выданняў, якія паўнавартасна спаборнічаюць з журналістамі рэспубліканскіх СМІ.

Колькасць удзельнікаў конкурсу штогод павялічваецца: калі ў 2007 г. у ім бралі ўдзел каля 30 журналістаў, то ў 2015 г. — ужо 65. Расце канкурэнцыя сярод конкурсных працаў, што ў выніку дазваляе журы вызначаць лепшых з лепшых у прафесіі.

### Кампанія “За фрыланс!”

Асноўная мэта кампаніі “За фрыланс!”— гэта легалізацыя дзейнасці журналістаў, якія працуюць у рэжыме фрыланс, а таксама ўраўнаважванне журналістаў з ліку фрылансераў з журналістамі рэдакцый СМІ ў рэальных правах і магчымасцях. На рэалізацыю гэтых мэтаў працуюць некалькі накірункаў дзейнасці кампаніі “За фрыланс!”. З аднаго боку, у фокусе

дзейнасці знаходзяцца самі **журналісты-фрылансеры**, з другога боку — журналісцкая супольнасць агулам, з трэцяга боку — дзяржаўныя органы і чыноўнікі з ліку суб'ектаў, якія парушаюць правы журналістаў-фрылансераў, з чацвёртага боку дзейнасць сфакусаваная на міжнародным супрацоўніцтве з арганізацыямі-партнёрамі для сумеснага ўплыву на сітуацыю.

**Накірункі дзейнасці:**

**Асветніцка-адукацыйны накірунак** — гэта падвышэнне пісьменнасці сябраў БАЖ у юрыдычнай і прафесійнай сферах. Адна з праблем у фрыланс-журналістыцы — няведанне самімі журналістамі спецыфічных прававых механізмаў па арганізацыі і легалізацыі сваёй дзейнасці.

- Юрысты арганізацыі правялі аналіз існуючага права і падрыхтавалі шэраг рэкамендацый для журналістаў-фрылансераў. Яны сабраныя ў адпаведных дапаможніках.
- Напрацягу справаздачнага перыяду было праведзена каля дзясятка выязных кансультацый юрыстаў у рэгіянальных філіях і суполках арганізацыі.
- Кампанія "За фрыланс!" запрашала перадавых спецыялістаў у галіне фрыланс-журналістыкі для правядзення майстар-класаў. Былі праведзеныя майстар-класы спецыялістамі з Нямеччыны (Клеменс Хофман), з Нарвегіі (Ёрн Вад), з Літвы (Эгле Дыгрыце), Швецыі (Сафі Хэйнэ), Беларусі (Аляксандр Таранціна-Ждановіч), Украіны і інш.
- Для падтрымкі маладых калег кампанія "За фрыланс!" ладзіць штогадовыя Школы маладога фрылансера —"АВС-фрыланс!". На занятках выкладаюцца асновы гаспадарчай дзейнасці ў рэжыме фрыланс, асновы аўтарскага права і захады па яго абароне, стратэгіі камунікацыі з замоўнікамі, алгарытмы вылічэння ганарару і інш. Праз гэты фармат экспрэс-навучання прайшлі каля паўсотні маладых журналістаў.
- Кампанія "За фрыланс!" дае магчымасць для дыстанцыйнай самаадукацыі шляхам збору і публікацыі адпаведных матэрыялаў на рэсурсе freelance.baj.by.
- На падвышэнне прафесійнага ўзроўню журналістаў-фрылансераў таксама скіраваны конкурс "Свабодны палёт", які ладзіцца штогод у снежні.

2. Другі буйны накірунак дзейнасці кампаніі "За фрыланс" — гэта **пабудова фрыланс-супольнасці**. Спачатку асноўным відам мерапрыемстваў па гэтым накірунку былі афлайн-сустрэчы з прадстаўнікамі супольнасці фрылансераў. На адной з такіх сустрэч нарадзілася ідэя пабудовы анлайнавай сеткі для журналістаў-фрылансераў. Так з'явіўся сайт ФББ (freelance.baj.by), які зараз з'яўляецца платформай для самапрэзентацыі журналістаў-фрылансераў, біржай прапаноў на супрацу, месцам для камунікацыі

журналістаў-фрылансераў паміж сабою і з рэдакцыямі СМІ. Запуск ФББ адбыўся 10 чэрвеня 2013 года. У межах кампаніі “За фрыланс!” прайшоў шэраг рэгіянальных прэзентацый сервісу ФББ. Аўдыторыя ФББ расце без прыцягнення рэкламы і інструментаў піяру.

Дзейнасць рэсурса накіраваная ў першую чаргу на сябраў БАЖ, колькасць зарэгістраваных адпавядае 18% ад агульнай лічбы сябраў арганізацыі.

Рэсурс для беларускага медыярынку стаў унікальнай з’явай. З гэтай прычыны мы сталі героямі перадачы на беларускім тэлебачанні “Кашалёк і жыццё”, выпуск якой быў прысвечаны фрылансу.

3. Трэці кірунак дзейнасці кампаніі звязаны з **паляпшэннем іміджу журналістаў-фрылансераў** у беларускім грамадстве. Для гэтага мы ажыццявілі выпуск шэрагу відэаролікаў, а таксама тэкставай прадукцыі на тэму фрылансу з удзелам рэальных журналістаў-фрылансераў, рэдактараў СМІ і экспертаў. Матэрыялы апублікаваныя на сайце ФББ.

4. **Спробы наладзіць дыялог унутры краіны паміж журналісцкай супольнасцю і суб’ектамі, якія прыцясняюць фрылансераў у правах**, палягалі ў межах чацвёртага адпаведнага кірунку дзейнасці кампаніі. Было праведзена некалькі мерапрыемстваў грамадскага кантролю (сустрэчы з начальнікамі раённых аддзелаў міліцыі, адкрытыя лісты і афіцыйныя пісьмовыя звароты ў суды, пракуратуры, міліцыю, парламент і г.д.), якія, аднак, не далі адчувальнага выніку.

5. **Гадавы маніторынг парушэння правоў журналістаў-фрылансераў**, неабходны для адэкватнай ацэнкі іх становішча у краіне. Гэты маніторынг прадстаўляецца карысным у першую чаргу пры перамовах з прадстаўнікамі міжнародный журналісцкай супольнасці.

## Кампанія “За права на інфармацыю”

У 2013 і 2015 г.г. праз апытанне журналістаў былі складзеныя рэйтынгі адкрытасці/закрытасці дзяржаўных органаў, у якіх ацэньвалася якасць іх працы са СМІ. Рэйтынгі паказалі існаванне сур’ёзнай праблемы: дзяржава праз законатворчасць і практыку ўсё больш закрывае доступ грамадзян, у тым ліку журналістаў, да інфармацыі. Кампанія “За права на інфармацыю” скіраваная на пераадоленне гэтай праблемы.

Праца ў межах кампаніі будзе накіраваная на некалькі мэтавых аўдыторый: прадстаўнікоў дзяржструктур (сустрэчы, “круглыя сталы”, абмеркаванне прапаноў па зменах у заканадаўства, абскарджанне адмоваў і г.д.), журналістаў (інфармаванне пра правы, збор подпісаў і г.д.), прадстаўнікоў НДА (інфармацыйная і экспертная падтрымка), міжнародных партнёраў (арганізацыя супольных слуханняў, папулярызацыя замежнага досведу і інш.).

## 4. Сайт

Сайт BAJ.by з’яўляецца інтэрактыўнай пляцоўкай для сустрэч сябраў ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», а таксама ўсіх, хто мае дачыненне да журналісцкай дзейнасці альбо цікавіцца журналістыкай. Гэта карпаратыўны рэсурс, заклікаваны ўмацаваць сяброўскія і прафесійныя сувязі ўнутры арганізацыі і ўсёй журналісцкай супольнасці Беларусі.

Гэта крыніца інфармацыі пра дзейнасць арганізацыі, пра падзеі ў галіне журналістыкі і СМІ ў Беларусі і за яе межамі. Акрамя штодзённай стужкі навін, тут сабраная таксама сістэматызаваная аналітычная інфармацыя пра сітуацыю са СМІ ў Беларусі з 2002 г. Гэта таксама сервісная інфармацыя для сябраў арганізацыі і журналістаў: абвесткі пра прафесійныя конкурсы і навучанне, інтэрактыўны каляндар інфармацыйных нагодаў, каардынаты экспертаў і г. д.

Акрамя таго, гэта яшчэ і месца для наладжвання нефармальных стасункаў і адпачынку, якое да таго ж дазваляе больш даведацца пра сваіх калег.

2014 год быў складаным для сайта. Найперш праз перанесеную вірусную атаку, якая пашкодзіла ўстойлівай працы рэсурсу ў пэўны перыяд і адбілася на наведвальнасці. Таму рост колькасці наведнікаў у параўнанні з папярэднім годам нязначны – 242 164 праглядаў старонак у 2014-м, 233 904 – у 2013-м.

На дадзены момант сітуацыя стабілізавалася. За першыя тры месяцы 2015 года колькасць праглядаў на 5 тысяч большая за паказчык аналагічнага перыяду ў 2014 г.

Разам з тым, рэдакцыяй вядзецца праца па распрацоўцы новага сайта з больш сучасным дызайнам, новымі рубрыкамі і г.д. Старт сайта чакаецца вясной-летам 2015 года.

Аснову інфармацыйнага напаўнення сайта baj.by складае ўласны кантэнт (выключэннем з’яўляюцца рубрыкі “Замежжа”, “Акцэнты”, “конкурсы і навучанне”, дзе вялікая колькасць запазычаных з іншых СМІ матэрыялаў). Колькасць уласных матэрыялаў у асноўных навінавых раздзелах (“Навіны” і “Рэгіёны”) ў два-тры разы перавышае колькасць запазычаных. Цалкам уласны кантэнт у рубрыкі “Навіны партнёраў”, у якой штотыдзень рыхтуецца агляд асноўных падзеяў у жыцці журналісцкай супольнасці свету.

На працягу 2014 года была пастаўленая на сталыя рэйкі падрыхтоўка ўласнага відэа. Гэты кантэнт, які размяшчаецца ў раздзеле «Відэа на сайце», карыстаецца сталай папулярнасцю, пра што сведчыць колькасць праглядаў (у сярэднім 400-600 на кожны сюжэт). Усё больш увагі надаецца мультымедыя-кантэнту. Напрыклад, да сусветнага дня “Станем за журналістыку” спецыяльна для сайта быў зроблены мультымедыя-праект “Партрэты” – падборка фотапартрэтаў на фоне аўдыёзапісаў галасоў журналістаў-фрылансераў, аштрафаваных за прафесійную дзейнасць (465 праглядаў).

Таксама дзеля прыцягнення ўвагі да сайта была выраблена анлайнавая флэш-гульня “Акрэдытацыя” – жартаўлівая інтэрактыўная гульня, дзе, запампаваўшы сваё фота на сайт, наведнік можа атрымаць сваю выяву ў

стылізаванай турэмнай форме (ідэя – падкрэсліць складанасць атрымання акрэдытацыі і павышаную адказнасць за працу без яе).

Актыўна вядзецца раскрутка сайта ў сацыяльных сетках: загалоўкі навінаў транслююцца ў Твітары, штодня паведамленні з сайта перадрукоўваюцца на Фэйсбук-старонцы БАЖ і на асабістай старонцы прэс-сакратара арганізацыі. Усе відэа ўласнай вытворчасці выкладаюцца на Youtube-канал БАЖ. Таксама дзеля павышэння наведвальнасці рэдакцыя адладзіла сістэму тыднёвых рассылак дайджэстаў найцікавейшых публікацый сайта па выніках тыдня.

## 5. Часопіс «АБАЖУР»

Сёлета карпаратыўны часопіс “Абажур” адзначыць сваё 15-годдзе. Па ўзроўні публікацый і значнасці тэм “Абажур” дамінуе сярод нешматлікіх беларускіх выданняў, якія тым ці іншым чынам закранаюць праблемы СМІ.

Аналітыка ды палеміка на старонках часопіса прапануюць чытачам незаангажаваны позірк на сутнасць грамадска-палітычных праблем, якія паўсталі не толькі перад беларускім грамадствам, але і міжнароднай супольнасцю. Галоўнымі тэмамі выдання з’яўляюцца абарона правоў журналістаў і свабоды слова, а таксама канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне і распаўсюд шматбаковай ды праўдзівай інфармацыі.

Штогод павышаўся аналітычны і літаратурны ўзровень публікацый часопіса. Сфармаваўся і пастаянна папаўняецца пазаштатны аўтарскі актыў, які мае аўтарытэт у шырокім журналісцкім асяродку. У часопісе друкуюцца таксама артыкулы нашых маладых калег, якія перамаглі ў творчых конкурсах БАЖ. Гэта стымулюе іх далейшы прафесійны рост, пераконвае ў тым, што яны зрабілі правільны выбар на карысць вольнага, непадцэнзурнага слова.

За мінулыя тры гады выйшла каля 20-ці падвоеных нумароў часопіса “Абажур”, у тым ліку і спецыялізаваныя выпускі, прысвечаныя бяспецы журналісцкай дзейнасці, аналізу і ўдасканаленню беларускага заканадаўства ў сферы СМІ, пераследу журналістаў-фрылансераў, падзеям ва Украіне, дзе працавалі і працягваюць працаваць нашы калегі.

Сёння “Абажур” стаў той пляцоўкай, дзе прысутнічае аналіз і асэнсаванне прафесійнай практыкі, дзе адбываецца пастаянная камунікацыя паміж рознымі структурамі незалежнай беларускай журналістыкі.

На старонках часопіса пастаянна адлюстроўваюцца праблемы развіцця і станаўлення рэгіянальнай незалежнай прэсы, дзейнасць філій БАЖ, што кансалідуе арганізацыю ў цэлым.

“Абажур” распаўсюджваецца і сярод структур выканаўчай улады Рэспублікі Беларусі, дасылаецца ў дзяржаўныя бібліятэкі, іншыя ўстановы.
“Абажур” – гэта летапіс жыцця арганізацыі, сумесных намаганняў яе сяброў у адстойванні права на прафесію.

## 6. Маніторынг сітуацыі ў галіне СМІ

БАЖ мае багаты досвед ажыццяўлення маніторынгу парушэнняў свабоды прэсы і сітуацыі ў сферы СМІ, які вядзе з 1998 г. Арганізацыя стварыла ўласную карэспандэнцкую сетку, якая пакрывае ўсе абласныя цэнтры і некаторыя рэгіянальныя гарады (10 цэнтраў маніторынгу).

БАЖ:

- Аператыўна фіксуе выпадкі парушэння правоў журналістаў і СМІ, сістэматызуе і аналізуе іх;
- Даводзіць факты парушэння свабоды слова да беларускай і міжнароднай грамадскасці (публікацыі ў перыядычным друку, у тым ліку ў часопісе «Абажур», распаўсюд аператыўнай інфармацыі, а таксама паведамленняў у выглядзе электронных бюлетэняў, размяшчэнне дадзеных маніторынгу на сайце БАЖ);
- Праводзіць кампаніі ў абарону свабоды прэсы;
- Сфармаваў унікальны банк дадзеных пра сітуацыю са СМІ ў Беларусі.

Вынікі маніторынгу сітуацыі ў галіне СМІ аналізуюцца, на іх падставе рыхтуюцца аператыўныя і перыядычныя справаздачы. Пасля мінулага з’езду БАЖ падрыхтаваў і размясціў на сайце на трох мовах (беларускай, рускай і ангельскай) 15 выпускаў электроннага бюлетэня “Масмедыя ў Беларусі”, 2 гадавыя справаздачы, а таксама 4 штоквартальных аналітычных агляды сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, якія БАЖ рыхтуе разам з шэрагам праваабарончых арганізацый краіны (раздзел “Свабода слова”). На англамоўнай і рускамоўнай старонках сайта, акрамя таго, размяшчаюцца зводныя дадзеныя маніторынгу “Тыдзень СМІ”.

Маніторынг парушэнняў правоў СМІ і журналістаў дазваляе не толькі дакументальна зафіксаваць факты парушэнняў, але і аператыўна адрэагаваць на іх, у тым ліку з дапамогай юрыдычных працэдур. Праца сеткі маніторынгу шчыльна звязаная з дзейнасцю юрыстаў ГА «БАЖ».

## 7. Міжнароднае супрацоўніцтва

У 2013 г. ГА "БАЖ" стала поўным сябрам Еўрапейскай Федэрацыі Журналістаў (EFJ). У 2014 г. арганізацыя стала часовым сябрам Міжнароднай асацыяцыі па абароне свабоды слова (IFEX).

Гэта падвышае аўтарытэт БАЖ на міжнароднай арэне і дазваляе падтрымліваць трывалыя стасункі з партнёрскімі журналісцкімі саюзамі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і палітычнымі структурамі. Гэтыя кантакты дапамагаюць трымаць у фокусе ўвагі міжнароднай супольнасці сітуацыю з правамі журналістаў і свабодай СМІ ў Беларусі.

Прадстаўнікі БАЖ бяруць удзел ва ўсіх штогадовых кангрэсах Еўрапейскай федэрацыі журналістаў. Практычна кожны з гэтых кангрэсаў разглядае сітуацыю ў Беларусі; МФЖ і ЕФЖ неаднаразова рэагавалі заявамі на парушэнні правоў журналістаў у Беларусі; разам з МФЖ працягвалася праграма арганізацыйнага развіцця БАЖ; БАЖ таксама ўдзельнічаў у вялікай праграме МФЖ у краінах былога Савецкага Саюза, прысвечанай бяспецы журналістаў. У межах праграмы па бяспецы БАЖ удзельнічаў у стварэнні нацыянальнай і міжнароднай базы дадзеных пра напады на журналістаў, а таксама ў навучанні журналістаў і падрыхтоўцы актывістаў па тэме бяспекі.

Добрыя працоўныя кантакты падтрымліваюцца з шэрагам іншых уплывовых міжнародных структур, сярод якіх – Офіс прадстаўніка па свабодзе СМІ АБСЕ, структуры Рады Еўропы і Еўразвяза.

Трывалыя кантакты і аўтарытэт БАЖ на міжнароднай арэне дазволілі праводзіць адукацыйныя праграмы для сяброў ГА «БАЖ», кансультацыі замежных экспертаў у рэдакцыях незалежных СМІ, арганізоўваць працоўныя вандроўкі беларускіх журналістаў.

Яшчэ адзін сур'ёзны дакумент, да стварэння якога далучыўся БАЖ, -- аналітычны даклад "За рэформы СМІ ў Беларусі". Гэты даклад быў падрыхтаваны сумеснымі намаганнямі БАЖ і арганізацыі "Індэкс цэнзуры" (Вялікабрытанія), яго прэзентацыі і абмеркаванні адбыліся ў Мінску, Лондане і Брuселі. У дакладзе разглядаецца медыяландшафт Беларусі, аналізуецца заканадаўства, якое ўплывае на свабоду СМІ, і пытанні бяспекі журналісцкай дзейнасці, утрымліваюцца рэкамендацыі па рэфармаванні медыясферы ў краіне.

Прадстаўнікі БАЖ бяруць актыўны ўдзел у працы падгрупы "Медыя" Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга Партнёрства. У прыватнасці, эксперты арганізацыі ўдзельнічалі ў складанні Індэкса свабоды медыя ў краінах УП, а таксама дапамаглі ў стварэнні дакладаў "Свабода медыя ў краінах Усходняга партнёрства" за 2013 і 2014 г.г.

Эксперты БАЖ бяруць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і абмеркаванні альтэрнатыўнага дакладу ў межах Універсальнага перыядычнага агляду ААН.

У перыяд з 2012 па 2015 г.г. адбыліся значныя падзеі па далучэнні БАЖ да сусветных трэндаў па абароне правоў журналістаў-фрылансераў. У прыватнасці, БАЖ увайшоў у Экспертную групу па фрыланс-журналістыцы ў

Еўрапейскай федэрацыі журналістаў (FREG) адразу пасля атрымання сяброўства ў гэтай кантынентальнай асацыяцыі.

Напрыканцы 2013 г. Рада БАЖ па рэкамендацыі Праўлення БАЖ адзінагалосна далучылася да Хартыі журналіста-фрылансера Еўрапейскай федэрацыі журналістаў.

Напачатку 2015 г. БАЖ далучыўся да ліку медыйных арганізацый, якія падпісаліся пад дакументам, што зацвярджае ўсеагульныя стандарты абароны фрылансераў у гарачых кропках.

Кіраўніцтва і актывісты БАЖ рабілі намаганні па прыцягненні ўвагі міжнароднай журналісцкай супольнасці да праблем беларускіх журналістаў-фрылансераў, звязаных з адсутнасцю іх прававога статусу і сталага пераследу з гэтай прычыны, насуперак канстытуцыйнай норме пра свабоду збору і распаўсюду інфармацыі (арт. 34 Канстытуцыі РБ).

У маі 2014 г. па запрашэнні Дацкага саюза журналістаў (DJ) удзельнічаў у З'ездзе журналістаў-фрылансераў Паўночных краін у Карсёры (Данія), падчас якога звыш 30 прадстаўнікоў аб'яднанняў журналістаў-фрылансераў падпісалі зварот да тагачаснага міністра інфармацыі з заклікам распачаць дыялог з БАЖ і ўсімі зацікаўленымі бакамі аб замацаванні прававога статусу журналіста-фрылансера ў Беларусі. На жаль, ніводзін з падпісантаў не атрымаў ніякага адказу ад беларускага міністра.

З прапановы французскага эксперта FREG чарговая сустрэча Экспертнай групы па фрыланс-журналістыцы, сумешчаная з міжнароднай канферэнцыяй "Роля і месца журналіста ў грамадстве. Асаблівасці дзейнасці журналістаў-фрылансераў у Еўропе і Беларусі", адбылася ў Мінску 13 кастрычніка 2014 г.